Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП(б) Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 57 (71) | Чацвер, 29 лістапада 1945 г.

## Таварышу Анастасу Іванавічу Мікаяну

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (бальшэвікоў) і Совет Народных Камісараў Саюза ССР горача вітаюць Вас, вернага саратніка таварыша Сталіна, віднейшага дзеяча партыі і Совецкай дзяржавы ў дзень Вашага пяцідесяцігоддзя.

З юнацкіх год Вы прысвяцілі свае жыццё рэволюцыйнай барацьбе за справу рабочага класа, за комунізм. На партыйнай рабоце ў Закаўказзі, Ніжнім Ноўгарадзе і на Паўночным Каўказе, на рабоце ў Совеце Народных Камісараў Саюза ССР, на ўсіх партыйных і дзяржаўных пасадах Вы з чэсцю выконвалі задачы, якія ставіла перад Вамі партыя. У годы Вялікай Айчыннай вайны Вы, як адзін з выдатнейшых кіраўнікоў соцыялістычнай гаспадаркі, з уласцівай Вам большэвіцкай энергіяй паспяхова служылі справе перамогі над ворагам.

Жадаем Вам, дарагі Анастас Іванавіч, многіх год здароўя і далейшай паспяховай работы на карысць нашай вялікай совецкай Радзімы.

**Цэнтральны Камітэт ВКП(б)**
**Совет Народных Камісараў Саюза ССР.**

## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

### АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ТАВ. МІКАЯНА А. І. ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

У сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння Намесніка Старшыні Соўнаркома СССР і Народнага Камісара Знешняга Гандлю таварыша Мікаяна А. І. і прымаючы пад увагу яго выдатныя заслугі перад партыяй і совецкім народам, узнагародзіць таварыша Мікаяна Анастаса Іванавіча ордэнам Леніна.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.**
**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.**

Масква, Крэмль.
24 лістапада 1945 года.

## ДАКЛАД ДЛЯ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ

У раённым цэнтры загадчык аддзела прапаганды і агітацыі РК КП(б)Б т. Цуркан зрабіў для інтэлігенцыі раёна даклад на тэму: „Совецкая дзяржава—самая дэмакратычная ў свеце".

Даклад праслухала звыш 200 чалавек настаўнікаў раёна.

## СХОД РЭПАТРЫІРУВАНЫХ

Днямі адбыўся раённы сход грамадзян, вярнуўшыхся з нямецкай няволі. З дакладам „Вялікая Айчынная вайна—справядлівая, вызваленчая вайна" выступіла загадчык арганізацыйна інструктарскім аддзелам РК КП(б) Б т. Мурына.

Даклад „Правы і абавязкі грамадзян СССР" зрабіў сакратар РК ЛКСМБ т. Шкроб.

Для прысутнічаўшых быў прадэманстраваны кінофільм „Марскі батальён".

## Хутчэй завяршыць нарыхтоўкі хлеба і бульбы!

Сяляне Акцябрскага, Аніскавіцкага, Дзегкаўскага, Першамайскага і Дзямідаўшчынскага сельсоветаў, імкнучыся да хутчэйшага залячэння ран, нанесеных краіне вайной, паспяхова завяршылі выкананне гадавога плана хлебапаставак дзяржаве і зараз здаюць збожжа ў фонд Перамогі.

Аднак вопыт перадавікоў не скарысталі асобныя сельсоветы, і на сёння працягваюць адставаць па пастаўках хлеба і бульбы. Вельмі дрэнна ідуць збожжанарыхтоўкі ў Дзераўноўскім сельсовеце. На 26 лістапада тут выканалі план толькі на 52,1 працанта. Амаль палавіну хлеба яшчэ трэба здаць дзяржаве! Але тут не спяшаюцца, з дня ў дзень зніжаюць тэмпы хлебавывазкі.

У апошнія дні зусім спынілі вывазку збожжа Худлінскі, Гарадзецкі, Каменскі і другія сельсоветы. Тлумачыцца гэта тым, што кіраўнікі сельсоветаў і знаходзячыяся там упаўнаважаныя райкома і райвыканкома пусцілі работу па хлебапастаўках на самацёк. Гэта бачна на прыкладзе Худлінскага сельсовета, які ўвесь час займаў у раёне 3—4 месца, а зараз апынуўся на шостым.

Наш раён займае апошняе месца ў вобласці па бульбапастаўках. Тут трэба адзначыць, што ні адзін сельсовет яшчэ не выканаў плана бульбанарыхтовак. Асабліва адстаюць Гарадзецкі сельсовет, выканаўшы ўсяго на 50 процантаў, Худлінскі на 58 процантаў і другія.

Усе мовы для паспяховай здачы хлеба і бульбы дзяржаве ёсць. Трэба толькі па-большэвіцку ўзяцца за рашэнне гэтай задачы. План здачы збожжа, бульбы і другіх відаў паставак—гэта закон для кожнай вёскі, сельсовета, і яго трэба выканаць пры любых умовах.

Хутчэй завяршыць нарыхтоўку збожжа, бульбы і другіх сельскагаспадарчых прадуктаў—такая задача партыйных, совецкіх, комсамольскіх арганізацый, усіх сялян і сялянак.

# Аб задачах моладзі ў перыяд падрыхтоўкі да выбараў

10 лютага 1946 года народы савецкай краіны па самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі будуць выбіраць Вярхоўны Совет СССР.

У нашым раёне з кожным днём усё шырэй і шырэй разгортваецца падрыхтоўка да выбараў. У кожным сельсовеце створаны агіткалектывы, куды многа ўвайшло комсамольцаў і несаюзнай моладзі. Агітатары разгарнулі работу па вывучэнню сярод насельніцтва выбарчага закона і Сталінскай Канстытуцыі.

З вялікай актыўнасцю прыняліся за гэту работу і комсамольцы. У Акцябрскім сельсовеце настаўнікі-комсамольцы Каменскай школы па населёных пунктах правялі ўлік выбаршчыкаў і па ўчастках у 10—15 двароў—прыступілі да вывучэння Палажэння аб выбарах і Канстытуцыі СССР. Добра працуюць агітатарамі і комсамольцы Запіўеўскага, Аніскавіцкага сельсоветаў.

Аднак не ўсюды яшчэ як след праводзіцца перадвыбарчая работа. Комсамольцы Гарадзецкага, Дзямідаўшчынскага сельсоветаў лічаць, што для таго, каб праводзіць громкую чытку выбарчага закона патрэбна сабраць каля 100 і больш слухачоў. Гэта не правільна. Выбарчы закон трэба давесці да кожнага выбаршчыка, яго трэба растлумачыць у кожным доме, кожнай дамашняй гаспадыне, кожнаму селяніну. Гэта вялікая работа, і выканаць яе можа з поспехам моладзь. Трэба толькі з усёй сур'ёзнасцю прыняцца за яе, для правядзення масава-палітычнай работы прыцягнуць больш перадавой моладзі, інтэлігенцыю вёскі. Трэба арганізаваць гурткі па дзесяцідворках.

Усю праводзімую палітычна-масавую работу патрэбна ўвязваць з прадстаячымі гаспадарчымі задачамі перад вёскай.

**Е. Балдыкаў.**
Сакратар РК ЛКСМБ.

# ФРЫДРЫХ ЭНГЕЛЬС

(125 год з дня нараджэння)

Фрыдрых Энгельс—вялікі саратнік Маркса, адзін з заснавальнікаў навучнага комунізма, правадыр і настаўнік міравога пролетарыята—нарадзіўся 28 лістапада 1820 года ў Германіі. У 1837 г. Энгельсу па настаянню бацькі прышлося пакінуць гімназію і паступіць прыказчыкам у адзін гандлёвы дом. Адначасова Энгельс узмоцнена займаўся сваёй навучнай і палітычнай асветай. Ужо з юнацкіх год ён зненавідзеў самадзяржаўе. На працягу усёй сваёй дзейнасці Энгельс вёў непрымірымую барацьбу супроць рэакцыйнага прусачаства і філісцёрства.

У канцы 1842 г. Энгельс пераехаў у Манчэсцер—у цэнтр тэкстыльнай прамысловасці Англіі. Тут ён уважліва вывучаў жыццё рабочых і ў выніку ў 1845 г. напісаў кнігу „Становішча рабочага класа ў Англіі".

У 1844 г. у Парыжы адбылася сустрэча Энгельса з Марксам, паклаўшая пачатак вялікай дружбы паміж двумя геніямі чалавецтва. У пачатку 1848 г. быў апублікаван напісаны Марксам і Энгельсам знатны „Маніфест комуністычнай партыі"—праграма „Саюза комуністаў". Разам з Марксам Энгельс прымаў актыўны ўдзел у рэволюцыі 1848 г. у Германіі, з'яўляўся адным з кіраўнікоў „Новой Рейнской газеты".

Энгельс прымаў актыўны ўдзел ва ўзброеным народным паўстанні ў 1849 г. і пасля яго паражэння эмігрыраваў у Англію.

Пяру Энгельса належаць такія важнейшыя творы марксізма, як „Анти-Дюринг", „Диалектика природы", „Происхождение семьи, частной собственности и государства", „Людвиг Фейербах" і другія. Энгельс быў першым ваенным тэарэтыкам пролетарыята. Ленін называў яго вялікім знаўцам гэтай справы. Сумесна з Марксам Энгельс кіраваў I Інтэрнацыяналам. Таксама як і Маркс, Энгельс горача вітаў Парыжскую Комуну, бачучы ў ёй першую спробу стварэння дыктатуры пролетарыята. Маркс і Энгельс жыва цікавіліся Расіяй, сачылі за рускім рэволюцыйным рухам і падтрымлівалі зносіны з рускімі рэволюцыянерамі.

Пасля смерці Маркса Энгельс апрацаваў і выдаў II і III томы „Капитала" Маркса і напісаў рад выдатных твораў па пытаннях марксісцкай стратэгіі і тактыкі. Ён кіраваў сусветным рабочым рухам і вёў няшчадную барацьбу з усімі праціўнікамі марксізма. „Пасля свайго друга Карла Маркса (памёршага ў 1883 г.) Энгельс быў самым выдатным вучоным і настаўнікам сучаснага пролетарыята ва ўсім цывілізаваным свеце" (Ленін).

Вучэнне заснавальнікаў навучнага комунізма Маркса і Энгельса, развітае і паднятае на новую, вышэйшую ступень Леніным і Сталіным, атрымала перамогу ў вялікай Краіне Советаў.

## ПРЫКЛАД ПАКАЗВАЕ БЫЎШЫ ВОІН

Чэсна выканаўшы свой абавязак перад Радзімай на полі бітвы, вярнуўся ў родную вёску Дубіны, Аніскавіцкага сельсовета дэмабілізаваны з Чырвонай Арміі Васілій Сцяпанавіч Соўпель.

З першых-жа дзён ён горача прыняўся за мірную творчую працу, за масавую работу ў сваёй вёсцы.

Праводзячы работу сярод сялян па вывучэнню Палажэння аб выбарах і Канстытуцыі, тав. Соўпель увязвае масава-палітычную работу з стаячымі задачамі перад вёскай. Быўшы воін першым выканаў хлеба-і бульбанарыхтоўкі, здаў сенанастаўку. Яго прыкладу паследвалі і аднавяскоўцы, разлічыўшыся з дзяржавай па хлебапастаўках.

**Ф. Сцепанюк.**

В.а. рэдактара
П. СПІРЫДОНАЎ

ГА 14878 Адрас рэдакцыі: г. Антопаль, Савецкая вуліца, дом № 1.